А. П. Меляшчук

# ПРЫЧЫНЫ, УМОВЫ, ВЫНІКІ І НАСТУПСТВЫ БЕРАСЦЕЙСКАЙ ЦАРКОЎНАЙ УНІІ 1596 Г. І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА КАНФЕСІЙНУЮ СІТУАЦЫЮ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XVII-XVIII СТСТ.

*Даклад прысвечаны разгляду абставін заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. і ее ўплыву на рэлігійнае жыццё насельніцтва беларускіх зямель у наступныя два стагоддзі.*

Спробы ажыццявіць царкоўную унію ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) рабіліся з пачатку XV ст. (Канстанцкі сабор, Фларэнційская унія). Менавіта на Берасцейскім саборы ідэя царкоўнай уніі была рэалізавана.

Галоўнай прычынай яе заключэння было імкненне да кансалідацыі царкоўных і свецкіх феадалаў ВКЛ і Польшчы пасля Люблінскай уніі. Праваслаўныя іерархі не жадалі падпарадкоўвацца маскоўскаму патрыярху, які прыняў гэты тытул у 1589 г. і меў намер пашырыць сваю царкоўную ўладу на ўсю тэрыторыю былой Старажытнарускай дзяржавы. У той жа час яны разлічвалі атрымаць прывілеі каталіцкіх біскупаў, абаперціся на падтрымку каталіцкай царквы ў нарастаючым канфлікце з праваслаўнымі брацтвамі і ў барацьбе з рэфармацыйным рухам. Папства праз унію імкнулася пашырыць свой уплыў на Усход [2, с. 316].

Адной з найбольш вострых праблем у жыцці заходнярускай царквы ў апошнія дзесяцігоддзі XVI ст. была праблема ўзаемаадносін царкоўных іерархаў і брацтваў. Іерархі жадалі падпарадкаваць брацтвы сваёй юрысдыкцыі і кантраляваць іх выхаваўчую і выдавецкую дзейнасць, але брацтвы насупраць актыўна ўмешваліся у царкоўнае жыццё, імкнучыся кантраляваць дзейнасць епіскапаў. Канфлікт паміж брацтвамі і іх свецкімі патронамі, з аднаго боку, і епіскапамі, з другога, быў одной з галоўных прычын схілення часткі епіскапаў да ідэі уніі з Рымам.

Іпацій Пацей лічыў, што ў царкве адбываецца развал і анархія: прыходскае духавенства з'яўляецца аб'ектам эксплуатацыі з боку свецкіх патронаў і прытрымліваецца іх жаданняў, не падпарадкоўваючыся уладзе епіскапаў; ідзе умяшанне простых людзей, членаў брацтваў, у царкоўныя справы з мэтай загадваць царкве, што ёй рабіць. Мялецій Сматрыцкі таксама пісаў, што царкоўнае жыццё праваслаўя знаходзіцца ў стане анархіі, вылучаючы такія ж прычыны заняпаду дысцыпліны і маральнасці духавенства, а таксама неадукаванасці. Адным з матываў для пошуку магчымасці уніі з Рымам для дзеячаў з такімі меркаваннямі была думка аб тым, што сваімі сіламі немагчыма навесці парадак у царкаўным кіраванні і дабіцца падпарадкавання епіскапаў уладзе метрапаліта.

Змен патрабавала і сістэма адукацыі. Начотніцкі тып адукаванасці не мог супрацьстаяць напору Рэфармацыі і каталіцкай Контррэфармацыі ў XVI ст. Змены былі неабходныя, каб захаваць этнічную самасвядомасць сацыяльнай эліты заходнярускага грамадства шляхам магчымасці атрымання адукацыі на тэрыторыі роднай краіны. Таксама ў канцы XVI ст. перажывала заняпад валоданне царкоўнаславянскай мовай на тэрыторыі Украіны і Беларусі [2].

23 снежня 1595 г. у Ватыкане ў прысутнасці Папы Рымскага Клімента VIII і двух праваслаўных архіерэяў ВКЛ – луцкага епіскапа Кірыла Цярлецкага і ўладзіміра-валынскага і брэсцкага епіскапа Іпація Пацея – была абвешчана царкоўная унія, замацоўваўшая вечнае далучэнне праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай да рымска-каталіцкай царквы. Другое абвяшчэнне адбылося 6-9 кастрычніка 1596 г. на Берасцейскім царкоўным саборы. Унію падтрымалі большасць епіскапаў на чале з Кіеўскім мітрапалітам Міхаілам Рагозай [4, с. 60, 64].

Адначасова ў Берасці свой сабор правяла праваслаўная апазіцыя. На саборы прысутнічалі два патрыяршыя экзархі Канстанцінопальскага і Александрыйскага патрыярхаў, два епіскапы, дзевяць архімандрытаў і іншыя праваслаўныыя іерархі. Сабор прыхільнікаў праваслаўя прыняў рашэнне не прызнаваць унію, пазбавіць сана мітрапаліта і тых епіскапаў, якія прынялі унію. Іх праклялі і асудзілі як адступнікаў [4, с. 64].

Кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт ІІІ Ваза універсалам ад 15 кастрычніка 1596 г. зацвердзіў унію. Яе ўмовы абавязвалі праваслаўную царкву прызнаць верхавенства папы рымскага і пераняць пэўныя дагматы каталіцызму. Такім чынам, праваслаўная царква стала грэка-каталіцкай. Яна захоўвала ранейшую арганізацыйную структуру, іерархію, права на набажэнства на царкоўнаславянскай ці мясцовай мове [4, с. 64] («руская» (старабеларуская) мова ў 1636 г. была замацавана як мова казанняў [3, с. 583]). Захоўваліся шлюбы святароў. Вышэйшыя пасады павінны былі займаць былыя праваслаўныя іерархі [4, с. 64].

Уніяцкая царква адразу ж сустрэла моцнае супраціўленне з боку праваслаўнага духавенства і вернікаў (у канцы XVI – пачатку XVII ст. праваслаўны апазіцыйны рух узначальваў князь В.К. Астрожскі). Новая рэлігія пачала ўводзіцца сілай і прымусам, што выклікала розныя формы барацьбы праваслаўных – ад пратэстаў, соймавых дэбатаў, антыуніяцкай палемікі, дзейнасці праваслаўных брацтваў да рознага роду выступленняў аж да паўстанняў (Магілёўскае паўстанне 1618 г., Віцебскае паўстанне 1623 г.) [3, с. 583].

У выніку супраціўлення праваслаўнага насельніцтва Беларусі і Украіны кіраўнікі грэка-каталіцкай царквы былі вымушаны змяніць тактыку [4, с. 64]. Мітрапаліт І.В. Руцкі правёў рэформы па ўмацаванні царквы і ўзвышэнні яе культурнага ўзроўню, якія

ўключалі ў т. л. стварэнне уніяцкага ордэна базыльян і сеткі бызыльянскіх школ. Заснаванне ўласнай сістэмы асветы адыграла важную ролю ў пашырэнні ўплыву ўніяцкай царквы, таксама як і праўнійная палемічная літаратура, што выдавалася ўніятамі ў базыльянскіх друкарнях. У ход таксама ішлі прапаведніцкае майстэрства прыхільнікаў уніі, дзейнасць уніяцкіх брацтваў, сродкі мастацтва, заснаванне сеткі храмаў і манастыроў [3, с. 583]. У Беларусі ордэн базыльян ужо ў XVII ст. меў больш за 50 манастыроў, найбуйнейшымі з якіх былі Жыровіцкі, Полацкі, Мінскі, Віцебскі, Быценскі, Антопальскі [4, с. 64]. Важнае значэнне меў прыклад аўтарытэту Мялеція Сматрыцкага, які прыняў унію. Усё гэта вяло да росту колькасці паслядоўнікаў уніяцтва. З 1630-х гг. на бок уніі сталі схіляцца сімпатыі беларускай шляхты. Аднак большасць паствы ўніяцкай царквы на працягу яе існавання складала сялянства.

Палітыка правячых колаў Рэчы Паспалітай адносна уніяцкай царквы мела супярэчлівы характар і неаднаразова мянялася ў сувязі са зменамі грамадска-палітычных абставін. З аднаго боку, улады падтрымлівалі уніяцкую царкву, з другога – жадалі зліць уніятаў з рыма-католікамі [3, с. 583]. Кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза спецыяльнай граматай замацаваў зямельныя і іншыя эканамічныя правы уніяцкіх цэркваў і манастыроў, каб заручыцца іх падтрымкай у сацыяльнай і канфесійнай палітыцы. Аднак кароль не змог дамагчыся месцаў у Сенаце для уніяцкага мітрапаліта і епіскапаў з-за супраціўлення каталіцкай большасці сенатараў, якія не жадалі, каб статус уніяцкай царквы дасягнуў узроўню каталіцкай. Толькі ў 1792 г. уніяцкаму мітрапаліту было дадзена права ўдзелу ў працы Сената [4, с. 64]. Такім чынам, недапушчэнне уніяцкіх іерархаў у Сенат сведчыла пра прыніжаны статус уніяцкай царквы, стаўленне да яе дзяржавы як да другараднай. Перавод уніятаў рымска-каталіцкім касцёлам у лацінскі абрад працягваўся увесь час існавання уніяцкай царквы [3, с. 583]. Гэта было вынікам польскай палітычнай, грамадскай і культурнай экспансіі. Галоўную ролю ва уніфікацыі абраднасці па лацінскаму ўзору адыграў Замойскі сабор 1720 г. [3, с. 584].

Паступова на працягу другой паловы XVII-XVIII ст. пашырылася сацыяльная база уніяцкай царквы і колькасць вернікаў [4, с. 65]. На 1790 г. на беларускіх землях Рэчы Паспалітай уніятамі былі ад 2/3 да ¾ насельніцтва (у сельскай мясцовасці да 80%) [3, с. 584; 4, с. 65].

Такім чынам, заключэнне Берасцескай уніі садзейнічала ўзмацненню канфесійных, а пасля і нацыянальных супярэчнасцей у поліканфесійнай і поліэтнічнай Рэчы Паспалітай, таксама паланізацыі беларускай шляхты.

### *Спіс літаратуры*


1. Брестская уния 1596 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – начале XVII в / Российская академия наук, Институт славяноведения, Отделение истории Средних веков. – Москва : Индрик, 1996. – Ч. 1: Брестская уния 1596 г. Исторические причины. Ч. 1 / [М. В. Дмитриев, Б. Н. Флоря, С. Г. Яковенко]. – 1996. – 199 с.
2. Грыцкевіч, А. Берасцейская унія 1596 / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. Абаленскі – Кадэнцыя. – 688 с. – С. 316-317.
3. Марозава, С. Уніяцкая царква на Беларусі / С. Марозава, А. Філатава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : У 6 т. – Мінск : БелЭн, 1993-2003. – Т. 6. Кн. 1 : Пузыны – Усая / Беларус. Энцыкл. ; Рэдкал. : Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. ; Маст. Э. Э. Жакевіч. – 2001. – 591 с. – С. 583-586.
4. Чаквін, І. У. Фарміраванне канфесій і іх эвалюцыя / І. У. Чаквін // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Навуковае выданне. – Мінск : БелЭн, 2000. – 432 с. – С. 59-68.



*Меляшчук Анастасія Пятроўна*, студэнтка 1 курса ФІТіК БДУІР, melshch1902@gmail.com

*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by